*Уладзімір Трапянок*

## МАТЫВЫ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ПАСТАНОЎКАХ АЙЧЫННАГА РАДЫЁТЭАТРА

Вусна-паэтычная творчасць, як адно з вузкіх азначэнняў фальклору, вельмі цесна пераплятаецца з уласцівасцямі радыёвяшчання, паколькі на радыё адным з галоўных выразных сродкаў з’яўляецца маўленне, вусная перадача інфармацыі. Адна з важных функцый радыё – выхаваўчая – перамяжоўваецца з самім англійскім тэрмінам «фальклор», які ў перакладзе абазначае народную мудрасць [1, с. 5], і гэта не што іншае, як рэтрансляцыя, перадача праз радыёэфір жыццёвага вопыту прашчураў і іх найлепшых творчых здабыткаў сённяшняму пакаленню случахоў, сярод якіх, вядома, ёсць дзеці і моладзь. І няцяжка здагадацца, што фальклор, як велізарная і неад’емная частка культуры ўсяго чалавецтва, гучаў і будзе выкарыстоўвацца ў перадачах да тае пары, пакуль існуе радыё.

Беларускае радыё, якое ўпершыню выйшла ў эфір у лістападзе 1925 года, сёння па-ранейшаму не страчвае пазіцыі лідара ў галіне радыёвяшчання нашай краіны, паколькі гэта разгалінаваная структура Белтэлерадыёкампаніі, што складаецца з двух агульнанацыянальных каналаў (Першы нацыянальны канал і канал «Культура»), а таксама трох радыёстанцый; вяшчанне вядзецца поўныя суткі. А ў далёкім 1925 годзе радыёстанцыя РВ-10 імя Саўнаркама БССР працавала ў эфіры толькі 30 хвілін за суткі. Часавыя адрэзкі паступова павялічваліся, імкліва пашыралася тэрыторыя вяшчання, і пакрысе Беларускае радыё стала жаданым госцем у кожным доме, паколькі прапаноўвала разнастайныя па змесце перадачы: ад інфармацыйных выпускаў да праграм мастацкага вяшчання, сярод якіх любімыя многімі і сёння радыёспектаклі.

У 1928 годзе Беларускае радыё транслiравала творчы вечар, прысвечаны айчыннаму мастацтву. Тады ж на радыёхвалях прагучала інсцэніроўка Ц. Гартнага «Чорт і Баба». Гэта падзея стала правобразам беларускай радыёдраматургіі, якая ў сярэдзіне 1930-х гадоў канчаткова аформілася ў мастацкую з’яву. Дарэчы, радыё ў параўнанні з тэатрам з пункту гледжання ўспрымання прапанаванага знаходзіцца ў больш выйгрышнай сітуацыі, паколькі на падмостках гледачы бачаць канкрэтнага персанажа, які ім можа, у прыватнасці, знешне не спадабацца, а на радыё, дзе гучыць толькі голас выканаўцы, у фантазіі нараджаюцца ўласныя вобразы, якія дакладна не атрымаюць негатыўнай афарбоўкі ў чалавечым уяўленні, паколькі сам слухач «малюе», стварае сваіх герояў.

На сённяшні дзень у фондах Беларускага радыё назапашаны сотні пастановак, якія спецыяльна ствараліся ў студыях, запісваліся ў тэатрах краіны, а таксама паступалі шляхам абмену з іншымі рэдакцыямі краін былога СССР. У прадстаўнічым спісе, зразумела, ёсць пастаноўкі, у аснову якіх пакладзена фальклорная спадчына. Іх праўда, не зусім многа, аднак смела можна прааналізаваць змест таго, што маецца.

У календары беларусаў асобную пазіцыю займае дахрысціянскае свята Каляды, звязанае з перыядам зімовага сонцастаяння. Так і сярод радыёпастановак, сугучных з фальклорам, гэтая тэма аказалася досыць запатрабаванай. Варта адзначыць радыёспектакль паводле апавядання У. Караткевіча «Калядная рапсодыя», які паставіла рэжысёр В. Кернажыцкая, аўтар інсцэніроўкі – В. Шушкевіч. Нельга абмінуць увагай так званы «літаратурны тэатр», дзе вельмі часта задзейнічаны адзін акцёр. Менавіта ў такім варыянце выканання ў фондах захоўваецца твор Р. Барадуліна «Як воўк калядаваў», рэжысёр – З. Паўлоўская, чытае народны артыст СССР Г. Аўсяннікаў.

Не менш запатрабаванай тэмай стала Купала (Купалле) – старажытнае абрадавае свята сонца і агню, божышчаў урадлівасці і росквіту зямлі [2, с. 125]. Так, на Беларускім радыё захоўваецца запіс спектакля Рэспубліканскага тэатра юнага гледача «Папараць-кветка», пастаўленага ў 1957 годзе заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Беларусь Л. Мазалеўскай. Гэта драма ў 3 актах з пралогам І. Козела. Аўтар удала выкарыстаў беларускую легенду пра пошукі чалавекам кветкі шчасця, якая арганічна ўведзена ў п’есу [3, с. 238]. Радыёверсія пастаноўкі захавала галасы акцёраў, што ігралі ў спектаклі, а гэта – народныя артысты Беларусі В. Лебедзеў і П. Дубашынскі, заслужаныя артысты Л. Цімафеева, Б. Барысёнак, В. Окалаў, У. Говар-Бандарэнка і іншыя.

Дарэчы, у канцы 1990-х гадоў у сувязі з рэарганізацыямі на Беларускім радыё пачаўся перыяд заняпаду радыётэатра. Ён працягваўся да 2006 года, пакуль не з’явілася пастаноўка «Ігнатаў рубеж», прымеркаваная да 20-годдзя Чарнобыльскай трагедыі, рэжысёр – А. Вінярскі. Адной з апошніх пастановак беларускага радыётэатра канца ХХ стагоддзя стаў музычны радыёспектакль «Купалава кола», рэжысёр – З. Паўлоўская, выканаўцы – артысты мінскіх тэатраў. Гаворка ў спектаклі ідзе пра асноўныя ўрачыстасці года паводле народнага календара. Сцэнарый з улікам традыцый напісала Г. Багданава. Кампазітар А. Залётнеў стварыў музыку, у якой пазнаюцца мелодыі народных песень.

Асобна хочацца звярнуць увагу на твор «Новая зямля» народнага паэта Беларусі Я. Коласа. Аўтар называў яе асноўнай паэмай ва ўсёй яго паэтычнай творчасці. І сёння «Новая зямля» справядліва ўспрымаецца шырокімі коламі грамадства як выдатная з’ява нацыянальнай культуры, як мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця, як Галоўная кніга не толькі ў творчасці Якуба Коласа, але і ва ўсёй беларускай літаратуры [4, с. 7-8]. На Беларускім радыё паэму запісвалі неаднаразова, паколькі змест яе і сёння не страчвае актуальнасці: «*І кожны дворык, кожна хата,/Хоць і жыве не так багата,/Але калядаў у адзнаку/Заколе хоць бы падсвінаку/І дворык свой ці прыгумень/Асвеціць раніцай ці ўдзень,/Бо хто ж,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*скажэце, хто не ласы/На тое сальца і кілбасы?*» (урывак з раздзела «Каляды» паэмы Я. Коласа «Новая зямля»).

Яшчэ адзін жанр народнай вусна-паэтычнай творчасці добра прыжыўся на Беларускага радыё – казкі. Так, больш за 50 гадоў у эфіры сённяшняга Першага нацыянальнага канала заснуць маленькім слухачам дапамагае праграма пад назвай «Вячэрняя казка». Рэдактары абіраюць творы, напісаныя сучаснымі аўтарамі, а таксама тыя, што бытуюць у народзе ўжо не адно дзесяцігоддзе. Агучваюцца «казкі-сплюшкі», па традыцыі, адным голасам выканаўцы.

У фондах захоўваецца вялікая колькасць радыёспектакляў, створаных па матывах беларускіх народных казак з прадстаўнічым акцёрскім саставам. Надзвычай плённа такія пастаноўкі запісваліся дзіцячай рэдакцыяй у 1980-я гады. У прыватнасці, у 1986 годзе народная артыстка Беларусі З. Браварская ажыццявіла радыёпастаноўку паводле аднайменнай беларускай народнай казкі «Іван світаннік», аўтар інсцэніроўкі для радыё – Г. Каржанеўская. Праз год З. Браварская паставіла спектакль па матывах беларускіх народных казак «Цікаўны Янка». У 1989 годзе запісалі радыёпастаноўку паводле беларускай народнай казкі ў апрацоўцы А. Якімовіча «Аддай тое, што дома не пакінуў», рэжысёр – заслужаны артыст Беларусі І. Лапцінскі. У фанатэцы захоўваюцца галасы выдатных майстроў сцэны, якія плённа працавалі перад мікрафонам для маленькіх слухачоў: В. Лебедзеў, М. Пятроў, Р. Маленчанка, Б. Уладамірскі, С. Журавель, В. Белахвосцік, Г. Гарбук, П. Дубашынскі, І. Курган, А. Падабед, А. Сідарава, Б. Барысёнак, Г. Кухальская, Т. Баўкалава і многія іншыя. Гэтыя ж выканаўцы актыўна ўдзельнічалі ў запісах спектакляў і для дарослай аўдыторыі.

На жаль, сёння на Беларускім радыё запіс спектакляў для дзяцей спынены. У эфіры канала «Культура» па пятніцах і панядзелках у рубрыцы «Дзіцячы радыётэатр» можна паслухаць пастаноўкі з фондаў. Час ад часу выкарыстоўваюцца запісы, створаныя на аснове фальклорнай спадчыны. У выхадныя ў вячэрнім эфіры двух агульнанацыянальных каналаў гучаць праграмы «Тэатр Беларускага радыё» і «Радыётэатр плюс», якія таксама звяртаюцца да фондавых запісаў радыёдрамы.

Аднаўленнем старых плёнак, іх рэстаўрацыяй займаецца дырэкцыя фондавых запісаў. Спектаклі, у тым ліку з фальклорнымі матывамі, паступова перапісваюцца на лічбавыя носьбіты, а гэта значыць, што праз гады яны будуць даступныя для новых пакаленняў радыёслухачоў, зразумела, не як вусная народная спадчына, а ў якасці паўнавартаснага твора прафесійнага мастацтва.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэбн. дапам. для філал. фак. ВНУ / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.] – 4-е выд. перапрац. – Мінск : Вышэйш. шк., 1996. – 856 с.
2. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.: іл.
3. Тэатральная Беларусь : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларус. энцыкл., 2003. – 2 т.
4. Якуб Колас: Новая зямля: Паэма / агул. рэд., паслясл. Я. Янушкевіча [і інш.] – Мінск : БФК, 2002. – 904 с., 91 л. іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ